Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт замежных моў»

Факультэт англійскай мовы
Кафедра беларускай філалогіі і замежнай літаратуры

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_______ / М.М. Воінава-Страха
«__» кастрычніка 2025 г.

УЗГОДНЕНА
В.а.дэкана факультэта
________ / М.М. Лойша
«__» кастрычніка 2025 г.

# ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «РУСКАЯ І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ»

для спецыяльнасці
6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»
(для замежных студэнтаў)

Складальнікі: М.М. Воінава-Страха, В.М. Губская

Регистрационное свидетельство № 1142545529 от 31.12.2025

Доступ к интерактивному ресурсу по ссылке:

https://moodle.bsufl.by/course/view.php?id=2742

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні
Навукова-метадычнага савета БДУЗМ
«__» ________ 2025 г., пратакол № ___

## Уводзіны

Электронны вучэбна-метадычны комплекс распрацаваны на аснове вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне “Руская і беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай” для спецыяльнасці для спецыяльнасці 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)».

Мэтай ЭВМК з’яўляецца павышэнне эфектыўнасці аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў шляхам метадычнага забеспячэння засваення і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу ў працэсе вывучэння дысцыпліны і падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі.

Задачы ЭВМК:

– забяспечыць адукацыйны працэс неабходнымі вучэбна-метадычнымі матэрыяламі для засваення ведаў пра адметнасці развіцця рускай і беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай, неабходных у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

– сфарміраваць сістэму ведаў пра заканамернасці развіцца рускай і беларускай літаратуры ў кантэксце агульнаславянскага і агульнаеўрапейскага літаратурна-культурнага ўзаемадзеяння;

– выпрацаваць навыкі аналізу літаратурных тэкстаў, параўнальна-супастаўляльнага вывучэння літаратурных з’яў;

– удасканаліць веды пра рускую і беларускую літаратуру XI – пачатку XXI стст. у кантэксце сусветнага літаратурнага развіцця;

– сфарміраваць разуменне нацыянальнай спецыфікі, ідэйна-мастацкіх асаблівасцей беларускай літаратуры, усведамленне яе месца ў сусветным літаратурным працэсе, канкрэтызацыя міжлітаратурных сувязей.

ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне “Руская і беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай” змяшчае неабходныя матэрыялы для лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама самастойнай работы, мэтай якіх з’яўляецца арганізацыя суправаджэння адукацыйнага працэсу.

ЭВМК уключае наступныя структурныя кампаненты: тэарэтычны, практычны, дапаможны раздзелы, раздзел кантролю ведаў.

## Інструкцыя карыстальніка электронным вучэбным выданнем

### Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні ЭВМК у адукацыйным працэсе

ЭВМК прызначаны для арганізацыі самастойнай і аўдыторнай работы студэнтаў (у тым ліку пры навучанні студэнта па індывідуальным вучэбным плане альбо ў іншых умовах адсутнасці студэнта на вучэбных занятках), а таксама для падрыхтоўкі да прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне “Руская і беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай”.

Рэкамендуецца наступны парадак работы з ЭВМК:

1. На першым этапе студэнтам трэба азнаёміцца са зместам **Дапаможнага раздзела** (мэтамі і задачамі дысцыпліны, размеркаваннем тэм па тыднях, рэкамендаванай літаратурай, формамі бягучага і прамежкавага кантролю, а таксама даведачнымі матэрыяламі), што дазволіць ім атрымаць агульнае ўяўленне пра вучэбную дысцыпліну, арганізаваць сваю самастойную работу і правільна размеркаваць час, неабходны для засваення зместу курса.

2. На наступным этапе неабходна звярнуцца да **Тэарэтычнага раздзела**, у якім прадстаўлены канспект лекцый і прэзентацыі па разделах курса.

3. Далей трэба перайсці да **Практычнага раздзела**, які змяшчае пералік пытанняў для семінарскіх заняткаў, актуальных літаратурных крыніц для самастойнай падрыхтоўкі, метадычныя рэкамендацыі па напісанні рэферата, эсэ, рэцэнзіі, распрацоўцы мультымедыйнай прэзентацыі, прыкладны спіс тэм і крытэрыі ацэнкі пералічаных відаў работы.

4. На заключным этапе рэкамендуецца звярнуцца да **Раздзелу кантролю ведаў**. Ён уключае матэрыялы для бягучай атэстацыі (прыкладны спіс эсэ, метадычныя рэкамендацыі па напісанні эсэ), а таксама матэрыялы для прамежкавай атэстацыі студэнтаў (у форме дыферэнцыраванага заліку ў 3 семестры): патрабаванні да навучэнцаў пры праходжанні прамежкавай атэстацыі, спіс пытанняў да заліку.